 DOI: 10.52928/978-985-531-807-2-2022-61-67

УДК 655.11(476.5-21Полацк)

# ВЫДАВЕЦКАЯ СПРАВА Ў ПОЛАЦКУ (1944—1991 гг.)

*Кашкур Дзіяна Андрэеўна,*
*магістр гістарычных навук,*
*старшы навуковы супрацоўнік Музея беларускага кнігадрукавання — філіяла НПГКМЗ*

*Прааналізавана выдавецкая справа ў Полацку ад часу вызвалення горада з-пад нацысцкай акупацыі да перыяду ўтварэння незалежнай Рэспублікі Беларусь і карэнных зменаў у выдавецка-паліграфічнай сферы краіны; разгледжана дзейнасць полацкай друкарні; даследавана друкаваная прадукцыя.*

***Ключавыя словы**: выдавецкая справа, друк, Полацк, XX ст.*

Выдавецка-паліграфічная галіна БССР за гады Вялікай Айчыннай вайны была амаль цалкам знішчана. З 200 даваенных прадпрыемстваў захаваўся Дом друку і некаторыя абласныя і гарадскія друкарні [18, с. 319]. Тым не менш, кіраўніцтва краіны разумела ролю выдавецкага сектара ў жыцці грамадства, бо ён заўсёды быў дзейсным сродкам і важнай зброяй у сферы ідэалогіі, з гэтай прычыны аднаўленне выдавецкай справы пасля вызвалення ішло хуткімі тэмпамі.

Яшчэ падчас пабудовы савецкай краіны намецілася тэндэнцыя да цэнтралізацыі выдавецка-паліграфічнай галіны, і ўжо да вайны асноўныя прадпрыемствы гэтай галіны дзейнічалі ў Мінску. Гэтая тэндэнцыя захоўвалася і пасля вайны: новыя дзяржаўныя выдавецтвы ствараліся і дзейнічалі ў сталіцы. Больш таго, цэнтралізацыя выдавецка-паліграфічнай галіны нават станавілася мацнейшай: калі ў 1966—1970 гг. у Мінску выдавалася 92,6% кніжнай прадукцыі, то ў 1981—1990 гг. — 95,9% [18, с. 326—327]. У сваю чаргу рэгіянальныя друкарні выконвалі запыты на друк брашур, афіш, лістовак і іншай друкаванай прадукцыі, а іх галоўнай задачай заставаўся выпуск мясцовых газет.

З вызваленнем Беларусі сістэма перыёдыкі краіны ствaралася практычна нанава, бо ні калектывы рэдакцый партызанскіх газет, ні друкарні не былі гатовыя да выпуску штодзённых выданняў. Таму адразу пасля вызвалення пэўнага населенага пункта ў ім будавалася друкарня і пачынала ствapaцца мясцовая газета [18, с. 334].

20 верасня 1944 г. была ўтворана Полацкая вобласць. Органам абкома і гаркома КП(б)Б, абласнога і гарадскога Саветаў дэпутатаў стала газета «Большэвіцкі сцяг». У лістападзе 1952 г. яна змяніла назву на «Сцяг камунізма» (з 1967 г. — «Сцяг камунізму»), і з 1954 г., пасля скасавання полацкай вобласці, газета стала гарадской [17 с. 160]. З 1991 г. і да сённяшняга дня гарадская газета выходзіць пад назвай «Полацкі веснік» [41].

Адразу пасля вайны выгляд газет з-за новага друкарскага абсталявання стаў аднатыпным: яны выходзілі альбо фарматам газеты «Правда» (блізкім да сучаснага фармату А2), альбо у палову ці чвэрць гэтага фармату [18, с. 334]. У 1950-х гг. «Большэвіцкі сцяг» выходзіў на 4-х старонках фарматам блізкім да А2, пазней стаў выходзіць фарматам блізкім да А3. Цана полацкай газеты ў 1951 г. складала 20 кап. [4, с. 1], у 1960 г. — 15 кап. [6, с. 1], у 1974 г. — 2 кап. [7, с. 1], у 1985 г. — 3 кап. [8, с. 1].

Галоўнымі тэмамі, што асвятляліся на старонках абласной газеты ў 1950-х гг., былі пытанні выканання плана, прадукцыйнасці працы, сацспаборніцтва, праблемы калгасаў і справы сельскай гаспадаркі. Тым не менш, у адрозненне, напрыклад, ад раённай газеты, «Большэвіцкі сцяг» асвятляў больш разнастайныя тэмы. Пэўны час у газеце існавала рубрыка «Па вялікай Совецкай краіне», дзе знаходзілі месца навіны з розных куткоў дзяржавы. Замежным навінам звычайна адводзілася ўся ці амаль уся апошняя старонка газеты. Напрыклад, у 1950-х гг. на гэтым месцы актыўна асвятляліся падзеі ў Карэі. Значна паўплывала на змест вышэйадзначанай старонкі Халодная вайна. У нумары абласной газеты за 23 верасня 1951 г. прадстаўлены артыкулы «Нота ўрада Чэхаславакіі ўраду ЗША» і «Цітаўская Югаславія — плацдарм агрэсіі ЗША», дзе ЗША выступае галоўным ворагам Савецкай краіны і яе саюзнікаў [5, с. 4]. А ў нумары «Большэвіцкага сцяга» за 25 верасня 1951 г. артыкул-перадрукоўка са «Звязды» — «Амерыкана-англійскія імперыялісты — злейшыя ворагі беларускага народа» — заняў нават асобную цэнтральную старонку перыядычнага выдання, дзе размясціліся «матэрыялы, якія выкрываюць крывавыя злачынствы імперыялістаў ЗША і Англіі на Беларусі ў 1917—1920 гг.» [34].

 DOI: 10.52928/978-985-531-807-2-2022-61-67

Зрэдку ў 1951 г. у абласной газеце з'яўлялася рэклама. Рэкламаваліся фільмы і новыя выпускі тамоў прац В. І. Леніна і І. В. Сталіна ў перакладзе на беларускую мову, а таксама змяшчаліся звесткі пра новыя кнігі беларускіх пісьменнікаў.

Афармленне абласной газеты спачатку было сціплым: падзел на калонкі рабіўся простымі лініямі, ілюстрацыі выкарыстоўваліся ў невялікім аб'ёме. У 1960-х гг. становішча змянілася, афармленне «Сцяга камунізма», на той час ужо гарадской газеты, стала больш прадуманым: артыкулы ў газеце часта падзяляліся разнастайнымі ўзорнымі рамкамі, ілюстрацыі пачалі выкарыстоўвацца амаль на кожнай старонцы (сярод іх фотаздымкі, малюнкі, выявы паштовак і інш.), часам іх было нават 2—3 штукі на старонку і болей.

Пераважная большасць артыкулаў «Сцяга камунізма» па-ранейшаму прысвячалася працоўным дасягненням і праблемам народнай гаспадаркі. Але побач з тым актыўней пачала размяшчацца і інфармацыя пра надзённыя справы горада, а таксама навіны культурнага жыцця. Так, у нумары «Сцяга камунізма» за 5 студзеня 1960 г. быў надрукаваны артыкул пра стварэнне Краязнаўчага музея ў сценахляснога тэхнікума [19]. А побач з ім размясціўся адказ на запыт у рэдакцыю па пытанні няякаснага медыцынскага абслугоўвання пэўным фельдшарам хуткай медыцынскай дапамогі Полацка [38]. Дарэчы, у газеце існавала і асобная рубрыка «З рэдакцыйнай пошты», куды жыхары горада дасылалі свае прапановы па паляпшэнні жыцця малой радзімы. Напрыклад, у «Сцягу камунізма» за 7 студзеня 1960 г. у гэтай рубрыцы размясціліся прапанова зрабіць гарадскі стадыён бясплатным для школьнікаў на час канікулаў, скаргі на атэлье і дастаўку пошты і інш. [43, с. 3].

Актыўней пачалі друкавацца ў гарадской газеце і антырэлігійныя матэрыялы. У вышэйназваным нумары быў змешчаны артыкул, у якім распавядалася пра «вялізарную шкоду Каляд... Яно (свята) расхіствае працоўную дысцыпліну, калечыць здаровы быт людзей, адцягвае працоўных ад актыўнага ўдзелу ў будаўніцтве камунізма» [39].

Апісаныя асаблівасці полацкай газеты 1960-х гг. вельмі нагадваюць гарадскую газету часоў НЭПа: змест яе стаў больш ліберальным, а тэматыка выдання значна пашырылася.

Яшчэ далей па змесце пайшла полацкая газета 1970-х гг.: у ёй з'явілася праграма тэлеперадач, пастаянная рубрыка «Сёння ў кінатэатрах», заметкі пра надвор'е, аб'явы з запрашэннямі на работу. Значна радзей на старонках «Сцяга камунізму» ў той час сталі з'яўляцца навіны замежжа, многія выпускі газеты ўвогуле іх не змяшчалі. Затое актыўней сталі асвятляцца пытанні культурнага жыцця. У «Сцягу камунізму» за 10 жніўня 1974 г. размясціліся заметка «У гонар Скарыны», прысвечаная мерапрыемствам, што павінны былі адбыцца 11 жніўня з нагоды адкрыцця помніка беларускаму першадрукару, у тым ліку прыезду беларускіх пісьменнікаў, агляду разнастайных кніг, літаратурным віктарынам і дэманстрацыі фільма «Я — Францыск Скарына» [47]. Як і ў часы НЭПа, у газеце з'явілася літаратурная старонка, дзе друкавалі свае вершы полацкія пісьменнікі — прадстаўнікі літаратурнага аб'яднання «Наддзвінне». На старонках перыядычнага выдання размяшчаліся не толькі вершы. Напрыклад, у нумары за 12 студзеня 1974 г. былі надрукаваны вершаваныя творы Н. Гальпяровіча, В. Аколава, Б. Аронінай, В. Чарняковай, празаічная гумарэска І. Стадольніка, а таксама крытычны артуыкул Г. Навумава пра творчасць паэта М. Губернатарава [44, с. 3].

На старонках «Сцяга камунізму» размяшчалася шмат артыкулаў пра музейнае жыццё горада. Напрыклад, у нумары полацкай газеты за 25 кастрычніка 1985 г. у рубрыцы «Адпачынак у выхадныя дні» прадстаўлены аб'явы пра канцэрт у Сафійскім саборы, выстаўку жывапісу ў Карціннай галерэі і экспазіцыю Музея баявой славы [45, с. 4]. Дарэчы, у полацкай газеце за 8 сакавіка 1985 г. змясціўся артыкул пра першы арганны канцэрт у сценах Сафійскага сабора, аздобілі артыкул фотаздымкі выканаўцы і поўнай канцэртнай залы [36]. Асвятлялася і праца рэстаўратараў, якія працавалі над адраджэннем гістарычных і архітэктурных помнікаў Полацка. У нумары за 27 лістапада 1985 г. рэстаўратары расказалі пра павелічэнне аб'ёму работы, пра складанасці і недахоп кваліфікаваных кадраў і план рэстаўрацыі Еўфрасіннеўскага манастыра [2].

Увесь выпуск «Сцяга камунізму» за 7 верасня 1990 г. быў прысвечаны Ф. Скарыну з нагоды 500-годдзя з дня яго нараджэння, а на 2-й старонцы нумара размясцілася фотасправаздача і матэрыялы па выніках эксклюзіўнай экскурсіі, праведзенай для журналістаў за два тыдні да адкрыцця Музея беларускага кнігадрукавання яго першай загадчыцай Г. П. Ладзісавай. Тут жа ўзгадваюцца кнігі беларускіх пісьменнікаў XX ст., «большасць якіх была рэпрэсавана», а таксама даецца ацэнка масаваму вывазу кніг у бібліятэкі Масквы, Пецярбурга, Львова і Кіева; такая публікацыя стала магчымай толькі на хвалі нацыянальнага адраджэння ў межах перыяду перабудовы [16].

Са студзеня 1948 г. па лістапад 1952 г. абласная газета выходзіла паралельна на рускай мове, спачатку пад назвай «Большевистское знамя», а затым, да студзеня 1954 г. (да скасавання выдання), пад назвай «Знамя коммунизма» [17, с. 64]. З гэтай нагоды полацкая дукарня павінна была атрымаць яшчэ адзін лінатып [26, л. 1]. Але гэта адбылося не адразу, таму першыя нумары павялічанага тыражу рыхтаваліся ручным і машынным наборам [27, л. 1]. У 1948 г. абласная газета выходзіла ў колькасці 15,3 тыс. экзэмпляраў, з іх на беларускай мове друкавалася 10,3 тыс. экзэмпляраў, на рускай — 5 тыс. [27, л. 78]. Тыраж газеты паменшыўся, калі яна страціла статус абласнога перыядычнага выдання. У пачатку 1960-х гг. «Сцяг камунізма» выходзіў тры разы на тыдзень накладам у 7 тыс. асобнікаў [42, с. 266]. У 1990 г. газета выходзіла тыражом больш за 20 тыс. экзэмпляраў [46, с. 4].

З верасня 1944 г. па снежань 1952 г. у полацкай друкарні выдавалася і раённая газета «Большэвіцкі шлях», якая са снежня 1952 г. выходзіла пад назвай «Сталінскі шлях». У студзені 1956 г. выданне раённай газеты было прыпынена [17, с. 154].

Галоўным спажыўцом газеты «Большэвіцкі шлях» павінен быў стаць калгаснік, бо газета вызначала сябе як раённае выданне. Таму яе тыраж быў значна меншы, чым тыраж абласной газеты: у 1945 г. выйшла 1 тыс. асобнікаў «раёнкі» [11, с. 2]. Адрозніваўся і кошт гэтых перыядычных выданняў: калі «Большэвіцкі шлях» каштаваў 15 кап. [13, с. 1], «Большэвіцкі сцяг» — 20 кап. [3, с. 1]. Раённая газета выходзіла радзей за абласную: спачатку 1 раз на тыдзень [10, с. 1; 12, с. 1], пазней 2 разы — у чацвер і нядзелю [14, с. 1; 15, с. 1], на 2-х ці 4-х старонках. Пасля вайны, калі выгляд газет рэспублікі стаў аднатыпным, «Большэвіцкі шлях» выходзіў у чвэрць фармату газеты «Правда» (блізкім да сучаснага фармату А4), а пазней у палову (блізкім да сучаснага фармату А3). З цягам часу ў выніку паляпшэння тэхнічнага абсталявання друкарняў паляпшалася і афармленне газет. З кожным годам «раёнка» ўсё больш аздаблялася ілюстрацыямі, і з цягам часу побач з фотаздымкамі кіраўнікоў краіны з'явіліся малюнкі, карыкатуры, карты і інш.

Абсалютная большасць артыкулаў раённай газеты прысвячалася справам калгаса, уборцы ўраджаю, выкананню і перавыкананню плана. Была і пастаянная рубрыка, у якой асвятлялася палітычнае жыццё замежных краін, яна размяшчалася напрыканцы апошняй старонкі газеты і называлася «За граніцай» ці «За рубяжом».

У 1945 г. на старонках «Большэвіцкага шляху» актыўна раскрывалася тэма Другой сусветнай вайны. Некаторыя нумары газеты амаль цалкам прысвячаліся гэтай тэме. Але на хвалі культу асобы І. В. Сталіна яна падавалася менавіта праз ухваленне асобы апошняга. Так, амаль увесь нумар «Большэвіцкага шляху» за 17 ліпеня 1945 г., выпушчаны да гадавіны вызвалення Мінска, быў прысвечаны асобе І. В. Сталіна, яго ўкладу ў перамогу і аднаўленне жыцця краіны пасля вызвалення [9, с. 1—4].

Цікавай з'явай стала размяшчэнне напрыканцы раённай газеты аб'яў пра судзебныя разбіральніцтвы з прычыны разводаў. Такія аб'явы сталі абавязковымі пасля ўскладнення працэдуры скасавання шлюбаў у СССР з 1944 г. [37].

З 1950 г. у раёнах БССР пачалі выдавацца газеты буйных калгасаў, саўгасаў і МТС [18, с. 334]. На Полаччыне такой газетай стала «Па запаветах Леніна», якая з'яўлялася органам партыйнай арганізацыі і праўлення калгаса «Запаветы Леніна» Полацкага раёна і выдавалася ў гарадской друкарні з ліпеня 1958 г. [17, с. 121]. Якасць такіх «нізавых» выданняў была невысокая, карэспандэнтаў для іх не хапала. Ужо праз некалькі год вялікая маса аднайменных, падобных адна на адну газет, у якіх доля карыснай інфармацыі была вельмі нязначнай, стала відавочна непатрэбнай, іх выпуск пачаў спыняцца [18, с. 334]. Газета «Па запаветах Леніна» спыніла выпуск у лютым 1960 г. За 2,5 гады выйшла 38 нумароў гэтага выдання [17, с. 121].

Усе вышэйпералічаныя газеты выдаваліся ў полацкай друкарні, якая была ўтворана адразу пасля вызвалення горада. Напачатку яна размяшчалася разам з рэдакцыяй абласной газеты. 26 чэрвеня 1945 г. рэдакцыя і друкарня раздзяліліся [21, л. 1], і з 1 ліпеня апошняя стала асобным прадпрыемствам са сваім памяшканнем і разліковым рахункам [21, л. 6]. Да студзеня 1954 г. полацкая друкарня была абласной, пазней стала гарадской, як і мясцовая газета. Да 1948 г. паліграфічнае прадпрыемства размяшчалася на вул. Войкава [24, л. 4], а затым пераехала ў адноўленую даваенную пабудову, якая знаходзілася на скрыжаванні вул. Камуністычнай і вул. Сака і Ванцэці [27, л. 24; 24, л. 167]), дзе знаходзілася да 1990 г. [40, с. 711]. 21 лютага 1947 г. па хадайніцтву полацкай друкарні ёй было прысвоена імя Георгія Скарыны [27, л. 109]. Дагэтуль гарадская друкарня носіць імя беларускага першадрукара і называецца «Спадчына Ф. Скарыны» [35].

Вытворчасць у друкарні наладзілася ў 1946 г., тады ж прадпрыемства пачало перавыконваць план работы. Напрыклад, у 1947 г. ён быў выкананы на 203,7% [22, л.3]. У друкарні працавала многа стаханаўцаў,

 DOI: 10.52928/978-985-531-807-2-2022-61-67

якія выконвалі план на 130—240% [22, л. 36—37]: у 1950 г. з 83 работнікаў друкарні 18 былі стаханаўцамі, 22 — ударнікамі, а брыгады наборшчыкаў і друкароў з'яўляліся брыгадамі выдатнай якасці [29, л. 70]. Тым не менш, многія са стаханаўцаў падчас працы дапускалі памылкі, за што ім ўразаліся прэміі [22, л. 35]. Але не заўсёды праца друкарні задавальняла запыты кіраўніцтва паліграфічнай галіны краіны. Напрыклад, у 1952 г. полацкая друкарня выканала план толькі на 95%. Нягледзячы на тое, што дырэктар прадпрыемства тлумачыў невыкананне плана недахопам сыравіны і матэрыялаў, яго абвінавацілі ў дрэннай арганізацыі работы [30, л. 110].

Многія станкі, машынкі, касы і інш., з якіх была сфарміравана тэхнічная база полацкай друкарні, былі трафейнымі: пасля заканчэння вайны на прадпрыемства паступілі 2 друкарскія машынкі, бастонка, карэктурны станок, дротава-швейны станок, 2 ручныя прэсы для пераплёту, 4 настольныя металічныя пліты, 12 кас-рэалаў, 270 наборных кас, 7 валікаў да машын, 3 чыгунныя печы для ацяплення, плавільная печ, прэс для прасавання адходаў, 2 матory пастаяннага току і інш. [21, л. 4]. Шрыфты, паперу, паліграфічныя матэрыялы для друкарні прывозілі з Мінска [23, л. 62; 29, л. 38] і Рыгі [24, л. 134; 29, л. 38], станкі прывозілі з Ленінграда [27, л. 1]. Пэўныя сродкі на будаўнічыя работы ў друкарні выдзяляліся з бюджэту: за 1945 г. на будаўніцтва для абласной друкарні было выдаткавана 153,6 тыс. руб. [21, л. 5]. З 1950-х гг. на паліграфчных прадпрыемствах горада пачалі ўсталёўваць новыя станкі і механізмы [40, с. 694]. Полацкая друкарня не стала выключэннем. З 1950 г. на паліграфічным прадпрыемстве пачалі асвойваць друкаванне каляровай прадукцыі спосабам высокага друку [40, с. 711]. Набыла друкарня таксама лінатыпы [20, с. 285; 31, л. 26] і цынкаграфію [20, с. 285].

Праца абласной друкарні павінна была стаць эталонам для раённых друкарняў і рэдакцый раённых газет. У красавіку 1952 г. выйшаў загад Упраўлення Белпаліграфвыдата, згодна з якім для павышэння якасці паліграфічнага выканання раённых газет абласныя друкарні павінны былі сумесна з рэдактарамі гэтых газет зацвярджаць малюнкі загалоўкаў і замяняць нездавальняючыя. Таксама абласныя друкарні павінны былі арганізаваць курсы для работнікаў раённых друкарняў [22, л. 68]. З 1 кастрычніка 1953 г. полацкая друкарня раз на тыдзень праводзіла тэхнічныя заняткі па наборным, друкарскім і пераплётным майстэрстве [32, л. 2]. Работнікі ж полацкага паліграфічнага прадпрыемства, у сваю чаргу, праходзілі навучанне ў Мінску [26, л. 21]. Тым не менш, на пачатак 1950 г. у полацкай друкарні не было ніводнага дыпламаванага спецыяліста [28, л. 107]. Затое тут расла колькасць работнікаў: калі ў 1941 г. у полацкай друкарні працавала 60 чалавек, то 1948 г. — 76 [27, л. 87], а ў 1950 — 83 [29, л. 70].

Нягледзячы на цеснае супрацоўніцтва полацкай друкарні і рэдакцыі мясцовай газеты, адносіны паміж імі часта былі напружанымі. Выклікана гэта было частымі затрымкамі разліку за выпуск газеты з боку рэдакцыі [27, л. 75; 29, л. 71]. Друкарня скардзілася на яе гарадскому ўпраўленню, спасылаючыся на тое, што з-за такіх затрымак на прадпрыемстве нельга забяспечыць своечасовую выплату зарплат [27, л. 75].

Акрамя выпуску газеты, полацкая друкарня займалася выданнем разнастайнай прадукцыі: брашур, бланкаў справаздачнасці [29, л. 75], плакатаў [33, л. 7], білетаў у кіно [27, л. 73], упаковак [24, л. 141], кансервавых, бутэлечных [29, л. 104] і цукерачных этыкетак [29, л. 74]; апошнія выпускаліся не толькі для Полацкага Гархарчкамбіната, але і для заводаў лёгкай і харчовай прамысловасці БССР [31, л. 37]. Копіі загадаў, інструкцый, растлумачэнняў, што выдаваліся абласнымі друкарнямі па запытах перыферыі, з 1 студзеня 1948 г. паступалі ў пракуратуру БССР [25, л. 13]. Рыхтавала друкарня і тавары шырокага спажывання: сшыткі, нататнікі, запісныя кніжкі; займалася вытворчасцю друкарскіх форм, клішэ, штампаў; прымала заказы на брашураванне і пераплёт [24, л. 141].

Прадукцыя, выпушчаная полацкая друкарняй, не заўсёды была якаснай, аб чым сведчыць выпадак, які адбыўся ў сакавіку 1948 г. У рэдакцыю «Крокодила» прыйшоў ліст разам з адным экзэмплярам бланка заявы, што выйшаў з полацкай друкарні. У лісце палачанін Ф. М. Шкецік выказаў здагадку, што шматлікія памылкі, зробленыя ў полацкай друкаванай прадукцыі, накіраваны на «устрашение мирных жителей нашего города», закончыў сваё пісьмо аўтар фразай «к сему, напуганный гуннами и чертями, Шкетик» [27, л. 33]. Відавочна, змест пісьма быў сатырычны, але наступствы за такія памылкі для дырэктара друкарні маглі быць сур'ёзнымі. Праз два тыдні дырэктар полацкай друкарні даслаў сакратару рэдакцыі «Крокодила» адказ на пісьмо Ф. М. Шкеціка з тлумачэннем, што бланкі заяў, выпушчаныя на полацкім паліграфічным прадпрыемстве ў колькасці 200 экзэмпляраў, былі надрукаваны амаль 2 гады таму пад кіраўніцтвам дырэктара Т. І. Маняк, якую пазбавілі пасады за дапушчэнне браку ў рабоце [27, л. 35].

 DOI: 10.52928/978-985-531-807-2-2022-61-67

Прадукцыя, што выпускалася ўсемі друкарнямі БССР, павінна была паступаць ва Усесаюзную кніжную палату. Датычылася гэтае правіла і газет: па 6 экзэмпляраў дасылаліся газеты, у тым ліку раённыя і абласныя, што выходзілі тыражом да 500 экзэмпляраў, па 39 экзэмпляраў — газеты, у тым ліку абласныя, што выходзілі тыражом большым за 500 экзэмпляраў [25, л. 5]. Абмен газетамі адбываўся і паміж абласнымі аддзеламі па справах паліграфіі і выдавецтваў. Пінскі [26, л. 18] аддзел прапаноўваў такі абмен полацкаму аддзелу. Мяняліся газетамі і самі друкарні, так, Віцебская абласная друкарня дасылала свае газеты полацкай друкарні [27, л. 69].

Сёння ў фондах Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея- запаведніка прадукцыя, выдадзеная з 1944—1991 гг. у гарадской полацкай друкарні, прадстаўлена ў вялікім аб’ёме: гэта 34 брашуры, 9 назваў кніг, 13 буклетаў, 50 афіш, 56 праграм, па 6 плакатаў і лістовак, больш за 20 запрашэнняў, віншаванняў і пропускаў і інш. Некаторыя з выданняў прадстаўлены ў некалькіх экзэмплярах (ад 2 да 5). Асабліва шырока прадстаўлены полацкія газеты: больш за 300 экзэмпляраў. Акрамя прадукцыі, выдадзенай у гарадской друкарні легальна, у фондах музея захоўваюцца выданні, створаныя на Полаччыне падпольна.

1970-я гг. сталі часам з’яўлення ў БССР нацыянальна выражанага непадцэнзурнага самвыдату. Самвыдат прадстаўляў сабой пераважна копіі раней выдадзеных кніг, прысвечаных гісторыі і культуры Беларусі. Але на старонках такіх выданняў з’яўляліся і новыя гістарычныя артыкулы з альтэрнатыўным поглядам на гісторыю краіны, палемічныя матэрыялы і выкрывальніцкія вершы [18, с. 337]. Першым выданнем такога кшталту ў рэспубліцы стаў наваполацкі рукапісны альманах «Блакітны ліхтар», першы нумар якога выйшаў у 1971 г. на 12 старонках. У альманаху друкавалі свае вершы полацкія аўтары: В. Мудроў, В. Шлыкаў, А. Рыбікаў, У. Арлоў, Г. Кулажэнка і інш. У 1970-х гг. развіццё самвыдату ў Наваполацку было прыпынена з-за канфлікта з КДБ і аднавілася толькі ў 1980-х гг. [1, с. 25].

У 1982 г. выйшла адно з першых аб’ёмных самаробных кніжных выданняў у Беларусі [18, с. 337] — «Падручны Расійска-Крыўскі (Беларускі) слоўнік» В. Ластоўскага. Ён быў надрукаваны ў Наваполацку на ратапрынце ў колькасці 30 экзэмпляраў [1, с. 26]. Дзве часткі слоўніка захоўваюцца ў фондах НПГКМЗ, як і самаробнае выданне «Сказа пра Лысую гару», створанае машынапісным наборам І. Ф. Жарнасек з паметамі С. Сокалава-Воюша. «Сказ пра Лысую гару» быў адным з найбольш папулярных самаробных выданняў у Беларусі [18, с. 337]. Захоўваецца ў фондах музея-запаведніка і самаробная кніга «Адвечным шляхам» І. Абдзіраловіча — фотакопія віленскага выдання 1921 г. у пераплёце зборніка вершаў П. Панчанкі, створаная С. Сокалавым-Воюшам у Наваполацку ў першай палове 1980-х гг. Гэтыя ўнікальныя выданні былі перададзены падчас святкавання 29-годдзя Музея беларускага кнігадрукавання наваполацкай пісьменніцай Ірынай Жарнасек.

Такім чынам, у выніку паступовай цэнтралізацыі кнігавыдання ў сталіцы БССР, якая распачалася яшчэ падчас усталявання савецкай улады, асноўнай задачай друку на перыферыі стала выданне мясцовых газет. Полацкая газета, што аднавіла свой выпуск амаль адразу пасля вызвалення горада, на пэўны час атрымала нават статус абласной. Змест перыядычнага выдання вызначаўся палітыкай партыі і прысвячаўся ў асноўным пытанням гаспадарчага і палітычнага жыцця краіны. Тым не менш, на старонках полацкай газеты сустракаюцца і ўнікальныя матэрыялы пра паўсядзённае жыццё горада, пра яго гісторыю і культуру. Акрамя газеты, у гарадской друкарні выдаваліся брашуры, афішы, плакаты, буклеты, праграмы, лістоўкі, бланкі, упакоўкі, этыкеткі і іншая друкаваная прадукцыя. А з 1970-х гг. на Полаччыне з’явіўся і нацыянальна выражаны непадцэнзурны самвыдат, першы на тэрыторыі краіны.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


1. Аркуш, А. З гісторыі полацкага самвыдату (1971—1996 гг.) / А. Аркуш // Недзяржаўная выдавецкая дзейнасць у Беларусі : гісторыя і сучаснасць : матэр. навук.-практ. канф., Мінск, 3—4 кастр. 1996 г. / Бел. дзярж. ун-т культ. і маст. — Мінск, 1997. — С. 25—27.
2. Арлова, В. Рэстаўратары / В. Арлова // Сцяг камунізму. — 1985. — 27 ліст. — С. 2.
3. Большэвіцкі сцяг. — 1945. — 5 вер.
4. Большэвіцкі сцяг. — 1951. — 1 вер.
5. Большэвіцкі сцяг. — 1951. — 23 вер.

 DOI: 10.52928/978-985-531-807-2-2022-61-67

6. Большэвіцкі сцяг. — 1960. — 1 студз.
7. Большэвіцкі сцяг. — 1974. — 1 студз.
8. Большэвіцкі сцяг. — 1985. — 1 студз.
9. Большэвіцкі шлях. — 1945. — 17 ліп.
10. Большэвіцкі шлях. — 1945. — 24 ліп.
11. Большэвіцкі шлях. — 1945. — 28 каст.
12. Большэвіцкі шлях. — 1945. — 31 ліп.
13. Большэвіцкі шлях. — 1946. — 12 каст.
14. Большэвіцкі шлях. — 1949. — 1 снеж.
15. Большэвіцкі шлях. — 1949. — 4 снеж.
16. Вярнуць нашчадкам гісторыю // Сцяг камунізму. — 1990. — 7 жн. — С. 2.
17. Газеты Беларусі 1776—1975 : бібліяграфічны паказальнік / склад. Л. М. Няхайчык [і інш.]. — Мінск : Нацыянальная кніжная палата Беларусі, 2003. — 322 с.
18. Гісторыя беларускай кнігі. У 2 т. Т. 2. Кніжнасць новай Беларусі (XIX—XXI стст.) / М. В. Нікалаеў [і інш.] ; навук. рэд. : В. В. Антонаў, М. В. Нікалаеў. — Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2011 — 436 с.
19. Гугнін, А. Краязнаўчы музей у лясным тэхнікуме / А. Гугнін // Сцяг камунізма. — 1960. — 5 студз. — С. 3.
20. Дэйніс, І. П. Полацкая даўніна / І. П. Дэйніс ; уклад, прадм. і камент. М. Баўтовіча ; пер. з рускай мовы М. Ермалаева. — Мінск : Медисонт, 2007. — 330 с.
21. Занальны дзяржаўны архіў у г. Полацку. — Ф. 974. — Воп. 1. — Спр. 2.
22. Занальны дзяржаўны архіў у г. Полацку. — Ф. 974. — Воп. 1. — Спр. 3.
23. Занальны дзяржаўны архіў у г. Полацку. — Ф. 974. — Воп. 1. — Спр. 4.
24. Занальны дзяржаўны архіў у г. Полацку. — Ф. 974. — Воп. 1. — Спр. 5.
25. Занальны дзяржаўны архіў у г. Полацку. — Ф. 974. — Воп. 1. — Спр. 7.
26. Занальны дзяржаўны архіў у г. Полацку. — Ф. 974. — Воп. 1. — Спр. 8.
27. Занальны дзяржаўны архіў у г. Полацку. — Ф. 974. — Воп. 1. — Спр. 9.
28. Занальны дзяржаўны архіў у г. Полацку. — Ф. 974. — Воп. 1. — Спр. 20.
29. Занальны дзяржаўны архіў у г. Полацку. — Ф. 974. — Воп. 1. — Спр. 28.
30. Занальны дзяржаўны архіў у г. Полацку. — Ф. 974. — Воп. 1. — Спр. 33.
31. Занальны дзяржаўны архіў у г. Полацку. — Ф. 974. — Воп. 1. — Спр. 41.
32. Занальны дзяржаўны архіў у г. Полацку. — Ф. 974. — Воп. 1. — Спр. 43.
33. Занальны дзяржаўны архіў у г. Полацку. — Ф. 974. — Воп. 1. — Спр. 46.
34. Ісачэнка, С. Амерыкана-англійскія імперыялісты — злейшыя ворагі беларускага народа / С. Ісачэнка // Большэвіцкі сцяг. — 1951. — 25 вер. — С. 3.
35. История предприятия // Наследие Ф. Скорины [Электронный ресурс]. — Режим доступа : https://tipografia-polotsk.vitebsk.by/History.html. — Дата доступа : 28.03.2021.
36. Каленік, А. Гучыць арган у Сафіі Полацкай / А. Каленік // Сцяг камунізму. — 1985. — 8 сак. — С. 4.
37. Кощеев, А. В. Расторжение брака по советскому законодательству / А. В. Кощеев // Вестник Вятского государственного университета. — 2010. — №4. — С. 75—79.

DOI: 10.52928/978-985-531-807-2-2022-61-67

38. Меры прыняты // Сцяг камунізма. — 1960. — 5 студз. — С. 3.
39. Мураўёў, І. Паходжанне і сутнасці каляд / І. Мураўёў // Сцяг камунізма. — 1960. — 5 студз. — С. 3.
40. Памяць : гіст.-дакум. хроніка Полацка / рэд. кал. : Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] ; маст. Э. Э. Жакевіч. — Мінск : БелЭн, 2002. — 912 с.
41. Полацкі веснік — люстэрка гісторыі // Полацкі веснік [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу : http://www.pvestnik.by/?page_id=14874. — Дата доступу : 28.03.2021.
42. Полоцк : исторический очерк / АН БССР. Ин-т истории ; ред-кол. : И. С. Кравченко, Н. В. Каменской — Минск : Изд-во Академии наук БССР, 1962. — 282 с.
43. Сцяг камунізма. — 1960. — 7 студз.
44. Сцяг камунізму. — 1974. — 12 студз.
45. Сцяг камунізму. — 1985. — 25 каст.
46. Сцяг камунізму. — 1990. — 29 снеж.
47. У гонар Скарыны // Сцяг камунізму. — 1974. — 10 жн. — С. 1.

## ИЗДАТЕЛЬСКОЕ ДЕЛО В ПОЛОЦКЕ (1944—1991 гг.)

*Кашкур Диана Андреевна,*
*магистр исторических наук,*
*старший научный сотрудник Музея белорусского книгопечатания — филиала НПИКМЗ*

*Проанализировано издательское дело в Полоцке в период от освобождения города от нацистской оккупации до создания независимой Республики Беларусь и коренных изменений в издательско-полиграфической сфере страны; рассмотрена деятельность полоцкой типографии; исследована печатная продукция.*

***Ключевые слова****: издательское дело, печать, Полоцк, XX в.*